Сугучча

# Спазнаючы культурныя коды

**Учора ў сталічнай кнігарні «Дружба» ва ўнісон гучалі беларуская і кітайская мовы — выдавецтва «Мастацкая літаратура» прэзентавала свае кніжныя праекты, прысвечаныя міжнароднаму культурнаму супрацоўніцтву, на адмысловай імпрэзе «Беларусь і Кітай: масты дружбы».**

**Дырэктар выдавецтва Алесь БАДАК** нагадаў пра найбольш важныя і значныя праекты ў гэтым кірунку — выданне серыі кніг «Даследаванне кітайскай цывілізацыі», якое выходзіць у свет пры падтрымцы Рэспубліканскай Канфедэрацыі прадпрымальніцтва ў Кітаі, а таксама серыі «Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры», што рэалізуецца дзякуючы супрацоўніцтву беларускага боку з Пекінскім выдавецтвам па выкладанні і даследаванні замежных моў.

«Такія кнігі, якія папулярызуюць у даступнай форме навуковыя веды пра іншыя краіны, даюць беларусам, перадусім моладзі, магчымасць убачыць свет з розных бакоў, спасцігнуць іншыя культурныя коды, паспрабаваць зразумець сусвет і філасофію ўсходняй цывілізацыі, — падкрэсліла **рэдактар серыі «Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры» Паліна ГРЫНЧАНКА.** — А гэты сусвет сапраўды вельмі адрозны ад нашага — часам нават з дапамогай вопытных, прафесійных перакладчыкаў нам з цяжкасцю ўдавалася знайсці ў беларускай мове адпаведнікі тым рэчам і паняццям, якія для кітайцаў цалкам зразумелыя і натуральныя».

У серыі «Даследаванні кітайскай цывілізацыі» выйшлі ўжо кнігі, прысвечаныя кітайскай музыцы і каліграфіі, рыхтуюцца наступныя выданні, прысвечаныя міфалогіі і літаратуры. І ўжо тут, адзначаюць даследчыкі, паміж нашымі такімі рознымі культурамі назіраецца пэўнае падабенства: у прыватнасці, беражлівае стаўленне да традыцый і самабытнай гісторыі.

Таксама сёлета працягнецца выданне маштабнай міжнароднай серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая», якую Выдавецкі дом «Звязда» распачаў яшчэ ў 2014 годзе і ў якой беларускія паэты і перакладчыкі адкрываюць для шырокага кола чытачоў вялікіх кітайскіх паэтаў — класікаў і сучаснікаў. «Канешне, вельмі цяжка знайсці пункты судакранання, адначасова зразумелыя для кітайскіх і беларускіх чытачоў, — зазначае **дырэктар міжнароднага радыё «Беларусь», паэт і перакладчык Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ,** — мабыць, найлепшым чынам дасягаюць адэкватнага перакладу не лінгвісты і даследчыкі мовы, а самі паэты, якія перадаюць не столькі словы, колькі вобразы і эмоцыі». А тое, што яны могуць быць зразумелымі нават без перакладу, прадэманстравалі вучні сталічнай гімназіі № 23, якія паралельна з рускай, беларускай і англійскай вывучаюць як другую замежную кітайскую — хлопцы прачыталі некалькі вершаў на мове арыгіналу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Будзь у курсе!

# МАГЧЫМАСЦІ БЕСКАНТАКТАВАГА ПРАЕЗДУ Ў МЕТРО ПАШЫРАНЫ

**З 11 студзеня на турнікетах станцый Мінскага метро можна аплаціць праезд яшчэ і бескантактавымі банкаўскімі карткамі Белкарт-Maestro, паведамілі ў прэс-службе метрапалітэна.**




Мінскі метрапалітэн сумесна з ААТ «БПС-Ашчадбанк», аплатнай сістэмай БелКарт і кампаніяй IBA Group пашырыў магчымасці аплаты праезду бескантактавымі банкаўскімі карткамі на турнікетах сталічнага метро. З 11 студзеня трымальнікам банкаўскіх картак аплатнай сістэмы БелКарт (банкаўскія карткі БелКарт-Maestro з бескантактавым інтэрфейсам) таксама дадзена магчымасць скарыстацца сэрвісам бескантактавых разлікаў за паездкі ў метро. Кошт праезду аналагічны цане жэтона.

Для аплаты праезду дастаткова паднесці банкаўскую картку да валідатара. Акрамя банкаўскай карткі, разлічвацца за праезд можна смартфонам ці іншым гаджэтам (бірулькамі, гадзіннікамі і іншымі прыладамі) з падтрымкай тэхналогіі NFC.

У прэс-службе звярнулі ўвагу пасажыраў на тое, што ў 2018 годзе партнёрамі метрапалітэна рэалізаваны механізм аб'яднання некалькіх паспяховых аплат праезду, здзейсненых на працягу 48 гадзін, у адну транзакцыю з адначасовым спісаннем з рахунку трымальніка карткі. На цяперашнім этапе максімальную колькасць аперацый, якія могуць агрэгавацца ў адну транзакцыю, — не больш за тры паспяховыя аплаты праезду. Зыходзячы з дзеючага тарыфу за праезд у метро 65 капеек, сума адной транзакцыі не перавышае 1 рубель 95 капеек.

Таксама нагадалі пасажырам, што, каб пазбегнуць непажаданага спісання грашовых сродкаў, неабходна прыкладваць да валідатара толькі тую картку, з дапамогай якой пасажыр жадае аплаціць праезд.

Пры неабходнасці атрымання дадатковай інфармацыі і электронных карт-чэкаў па здзейсненых плацяжах банкаўскай бескантактавай карткай на турнікетах метрапалітэна, можна звяртацца на партал paybaycard.by або ў Цэнтр падтрымкі кліентаў кампаніі IBA Group па тэлефоне: +375 17 217-39-50.

Карыстальнікі сэрвісу могуць адсочваць здзейсненыя паездкі, а таксама сумы аплаты па іх у асабістым кабінеце на сайце paybycard.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Крымінал, здарэнні

## ДЫК ШТО ЗДАРЫЛАСЯ Ў ЛЕСЕ?

**Навіна пра тое, што ў Талачынскім раёне знайшлі цела параненага — магчыма, жывёламі — мужчыны стала тэмай для абмеркавання ў інтэрнэце.**

Вяскоўца ва ўзросце за пяцьдзясят гадоў, жыхара населенага пункта Сакалянка, з цялеснымі пашкоджаннямі знайшлі тутэйшыя жыхары. Інцыдэнт адбыўся яшчэ ў пачатку снежня.

— Упраўленнем Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці прызначаны комплекс судова-медыцынскіх экспертных даследаванняў, па выніках якіх будзе ўстаноўлена дакладная прычына смерці мужчыны, — паведамілі ў ведамстве.

Адназначна канстатаваць прычыну смерці, тым больш сцвярджаць, што чалавека пакусалі звеpы, пакуль што рана.

Калі пасля судова-медыцынскай экспертызы будуць зроблены вывады, віцебскае ўпраўленне дасць канкрэтны адказ аб прычынах смерці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ГОРА-РЭКЕЦІРЫ

**Двое мінчан спрабавалі выбіць грошы з даўжніка, а ў выніку «зарабілі» крымінальную справу.**

Як паведамілі ў Следчым камітэце, 30-гадовы мужчына і яго 26-гадовая сяброўка па просьбе свайго знаёмага вырашылі дапамагчы яму вярнуць доўг. Яны сустрэліся з даўжніком каля аднаго са сталічных супермаркетаў. Але домовіцца «па-добраму» не ўдалося. Не прыдумаўшы нічога лепшага, маладая пара адабрала ў даўжніка мабільны тэлефон і запіхнула бедака ў аўтамабіль, пагражаючы фізічнай расправай. Прыехаўшы да гаража, які належаў дзяўчыне, абвінавачаныя паспрабавалі зацягнуць пацярпелага ў падвал. Але ў іх нічога не выйшла, паколькі даўжнік аказаў актыўнае супраціўленне.

Тады яны патэлефанавалі маці пацярпелага і запатрабавалі аддаць ім аўтамабіль коштам больш за сем тысяч рублёў, выказваючы пры гэтым пагрозы прымянення гвалту да яе сына. Аднак, не дабіўшыся свайго, яны пакінулі мужчыну каля гаража і з'ехалі.

Дзеянні выкрадальнікаў кваліфікаваны паводле ч. 1 арт. 183 (незаконнае пазбаўленне волі), ч. 2 арт. 206 (рабаванне), ч 2. арт. 208 (вымагальніцтва) Крымінальнага кодэкса Беларусі. Мужчына заключаны пад варту, а дзяўчына знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

## ПАЙШЛА Ў БАЛОТЫ І ЗНІКЛА

**У цэнтр аператыўнага кіравання ратавальнікам Кобрынскага раённага аддзела МНС ад дзяжурнага РАУС паступіла паведамленне пра неабходнасць аказання дапамогі ў пошуку зніклага чалавека ў раёне вёскі Балоты.**

Са слоў сваякоў жанчыны, 83-гадовая пенсіянерка, жыхарка вёскі Магдалін сышла ў вёску Балоты на пахаванне сваякa і прапала. Сувязі з ёй не было.

У пошуках заблукалай жанчыны ўдзельнічалі супрацоўнікі МНС, РАУС, валанцёры. Праз некалькі гадзін у лясным масіве, за 7 кіламетраў на поўдзень ад вёскі Балоты, жанчына была знойдзена ратавальнікамі. Бабулю агледзела брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, ад шпіталізацыі яна адмовілася, паведамілі ў МНС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Фінансы

## ІНФЛЯЦЫЯ Ў 2018-М — 5,6 %

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў снежні мінулага года ў параўнанні з лістападам склаў усяго 100,8 %, а са снежнем 2017 года — 105,6 %, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.**

Спецыялісты Белстата ўдакладняюць, што базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, падлеглыя ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у снежні мінулага года ў параўнанні з лістападам склаў 100,3 %, са снежнем 2017-га — 104,8 %.

Эксперты таксама адзначылі, што за ўвесь мінулы год харчовыя тавары падаражэлі на 5,7 %, а цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 3,8 %. Індэкс спажывецкіх цэн на паслугі ў снежні склаў 101,2 % да лістапада 2018 года і 108,1 % да снежня 2017-га. Мэтавы параметр па інфляцыі на мінулы год — не больш за 6 %

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЛІЧБАВЫ ОФІС САМААБСЛУГОЎВАННЯ

### У Кобрыне адкрылі першае аддзяленне банка без супрацоўнікаў

**Гэты філіял рэгіянальнай сеткі БПС-Ашчадбанка цяпер працуе па-асабліваму, — у ім няма звыклых касіраў і кансультантаў, а ўсе фінансавыя пытанні можна вырашыць праз шматфункцыянальны кіёск або тэрмінал.**

Лічбавы офіс карэнным чынам адрозніваецца ад класічных аддзяленняў. У ім няма звыклых кас і рабочых месцаў, а амаль любую банкаўскую аперацыю можна здзейсніць самастойна. На першым этапе банкаўскія работнікі ўсё ж будуць побач. Яны дадуць кансультацыю і акажуць дапамогу ў наладжванні дыстанцыйных сэрвісаў. Як толькі людзі прывыкнуць — офіс пачне працаваць аўтаномна. Асабістыя кансультацыі таксама будуць магчымыя, дастаткова папярэдне ўдакладніць час сустрэчы з прадстаўніком банка.

«Для кліентаў важна мець доступ да новых тэхналогій. Такі запыт фіксуем не толькі ў жыхароў сталіцы, таму лагічна, што smart-праекты атрымліваюць развіццё і ў рэгіёнах. Лічбавы офіс у Кобрыне — гэта правобраз аддзялення будучыні, — разважае **намеснік старшыні праўлення БПС-Ашчадбанка Алег БАРОДКА.** — Развіццё тэхналогій дазваляе кліентам большасць фінансавых аперацый здзяйсняць самастойна — як са смартфона або ноўтбука, так і праз тэрміналы і шматфункцыянальныя кіёскі».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Фігурнае катанне

## АНШЛАГУ БЫЦЬ!

### На першынство кантынента па фігурным катанні ў Мінску прададзена 85 % білетаў

**Аргкамітэт чэмпіянату Еўропы па фігурным катанні выпусціў у продаж дадатковыя месцы на тры заключныя дні мерапрыемства.**

— Згодна з першапачатковым планам, мы павінны былі прадаць усе білеты на два асноўныя ўзроўні «Мінск-Арэны», ёмістасць якіх на кожны дзень складае каля дзевяці тысяч месцаў. План ужо выкананы па трох з пяці асноўных дзён чэмпіянату. Таму на іх — пятніцу, суботу, нядзелю — мы выпускаем дадатковыя білеты на верхні ярус арэны. На сераду і чацвер трыбуны запоўнены на 70 %, месцы на ніжніх узроўнях яшчэ ёсць. Сумарна ў нас цяпер прыкладна на 85 % ад планавага ўзроўню продажаў, і гэта вельмі добры вынік, — адзначае **Юлія КОМЛЕВА, старшыня Беларускага саюза канькабежцаў.**

Нагадаем, у рамках чэмпіянату Еўропы ў Мінск упершыню прыедуць вядучыя фігурысты кантынента і свету. Сярод іх алімпійская чэмпіёнка Аліна Загітава (Расія), двухразовы чэмпіён свету Хаўер Фернандэс (Іспанія), трохкратныя чэмпіёны свету Габрыэла Пападакіс/Гіём Сіззірон (Францыя) і іншыя.

Цырымонія адкрыцця чэмпіянату адбудзецца 23 студзеня. Спаборніцтвы будуць праходзіць з серады 23 студзеня да суботы 26 студзеня ўключна. 21 і 22 студзеня гледачы змогуць наведаць афіцыйныя трэніроўкі. Закрые чэмпіянат 27 студзеня гала-канцэрт з удзелам прызёраў спаборніцтваў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**